Прыведзеная алгебраічная мадэль дазваляе ажыццяўляць дакладны структурны аналіз музычнага ўзору.

**Зыгмантовіч С.В.,** *дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ

На фоне сённяшніх пераўтварэнняў неабходнасць змен у бібліятэчнай справе становіцца ўсё больш відавочнай. На першы план вылучаецца задача павышэння якасці прафесійнай падрыхтоукі спецыяліста, узровень якой залежыць ад агульнай, (у тым ліку, і інфармацыйнай, бібліяграфічнай) культуры асобы бібліятэкара-бібліёграфа.

Асэнсаванне інфармацыйнай культуры як асаблівага, адносна самастойнага аспекту культуры стала магчымым у выніку распрацоўкі інфармацыйнага падыходу да пазнання рэчаіснасці, развіцця ўяуленняў аб інфармацыйным грамадстве, у якім інфармацыйныя рэсурсы па сваёй значнасці не саступаюць энергетычным, фінансавым і іншым стратэгічным рэсурсам, а сама інфармацыя ацэньваецца як эканамічная катэгорыя. Праявамі гэтага асэнсавання ў бібліятэчнай сферы з`явіліся такія арганізацыйныя вынікі, як стварэнне Міжнароднай Акадэміі інфарматызацыі, перайменаванне бібліятэчных факультэтаў у ВНУ культуры ў факультэты бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, правядзенне шматлікіх канферэнцый па абмеркаванню праблем інфарматызацыі грамадства і інфармацыйнай культуры, увядзенне ў ВНУ культуры спецыяльных вучэбных дысцыплін, такіх як «Інфармацыйная культура асобы» і г.д.

На сённяшні дзень адсутнічае агульнапрынятае азначэнне паняцця «інфармацыйная культура». Можна гаварыць аб інфар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мацыйнай культуры грамадства, пад якой М.Я.Дворкіна прапануе разумець сукупнасць ведаў, норм і правіл, каштоўнасцей, створаных ў інфармацыйнай дзейнасці і адлюстроўваючых пэўны ўзровень яе развіцця. Можна гаварыць аб інфармацыйнай культуры пэўнай сацыяльнай групы, індывіда. Большасць даследчыкаў характарызуе сучасную інфармацыйную культуру як якасную дзейнасць чалавека ў галіне атрымання, стварэння, перадачы, захоўвання і выкарыстання інфармацыі. Гэта ж палажэнне распаўсюджваецца і на бібліяграфічную культуру, як састаўныя інфармацыйнай культуры, валоданне якой дазваляе асобе ажыццяўляць названыя віды дзейнасці ад стварэння да выкарыстання ў адносінах да другаснай бібліяграфічнай інфармацыі.

Бібліяграфічная культура пранізвае ўсю дзейнасць бібліяграфічнага работніка, з`яўляецца кампанентам не толькі яго агульнай культуры, але і прафесійнай, падмуркам прафесійнай дзейнасці. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры будучага спецыяліста прадугледжвае авалоданне ім бібліяграфічнымі ведамі, уменнямі, і навыкамі арганізацыі і ажыццяўлення бібліяграфічных працэсаў, пазнання і ацэнкі дакументаваных тэкстаў і іх патокаў, бібліяграфічных знакавых сістэм, неабходных для пошуку і ідэнтыфікацыі дакументаў у мэтах аптымальнага функцыянавання ў сістэме сацыяльных камунікацый як саміх тэкстаў, так і рэпрэзентатыўных звестак аб іх.

Комплекс прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў стварэння і выкарыстання бібліятэчна-бібліяграфічных сродкаў перадачы дакуменціраванай інфармацыі, культура бібліяграфічнага мыслення і дзелавых зносін у працэсе інфармацыйных камунікацый фарміруюцца ў будучых бібліятэкараў у працэсе засваення імі спецыяльных бібліяграфічных дысцыплін. Адной з такіх спецыяльных агульнабібліяграфічных дысцыплін з’яўляецца «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэцы». На сённяшні дзень у выкладанні гэтага курса адбываюцца пэўныя змены, звязаныя з неабходнасцю актуалізацыі яго зместу, перагляду тэхналогіі выкладання, вызначэння яго адпаведнасці сучасным канцэпцыям падрыхтоўкі спецыялістаў для работы ў постіндустрыяльным грамадстве.

Нягледзячы на шматлікія матэрыяльна-тэхнічныя, эканамічныя цяжкасці, бібліятэкі нашай рэспублікі пастулова набываюць камп'ютэрную тэхніку, укараняюць новыя інфармацыйныя тэхналогіі, ставяць задачы выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў праз сусветныя інфармацыйныя магістралі і падрыхтоўкі сваіх інфармацыйных прадуктаў, якія б уяўлялі цікавасць на сусветным інфармацыйным рынку і адпавядалі яго патрабаванням. Усё гэта абумоўлівае неабходнасць таго, каб ужо на этапе навучання нашы студэнты авалодалі трывалымі навыкамі выканання бібліяграфічных працэсаў з выкарыстаннем ЭВМ. На працягу пэўнага перыяду амаль усю работу па фарміраванню інфармацыйнай пісьменнасці студэнтаў выконвала кафедра аўтаматызацыі бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. Але практыка паказвае, што гэтыя задачы павінны вырашацца і ў курсах бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін. І пэўная работа ў гэтым накірунку вядзецца.

Пры выкладанні курса «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы» ў раздзелах, прысвечаных фарміраванню даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, характарыстыцы інфармацыйных рэсурсаў, студэнты атрымліваюць уяўленне аб айчынных і замежных банках і базах даных, генерыруемых і набываемых бібліятэкамі рэспублікі, аб іх якасных характарыстыках, праблемах іх камплектавання ў даведачна-бібліяграфічны фонд, крыніцах інфармавання аб дадзеным інфармацыйным рэсурсе. Практычныя навыкі фарміравання такога бібліяграфічнага прадукта, як сістэматычная картатэка артыкулаў, студэнты набываюць у ходзе спецыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лабараторных заняткаў, якія праводзяцца з выкарыстаннем як традыцыйнай, так і аўтаматызаванай тэхналогіі. Гэта дае студэнтам магчымасць параўнаць дадзеныя тэхналогіі, вызначыць перавагі, параўнаць вынікі ў выглядзе выхадных форм бібліяграфічнай прадукцыі. Распрацавана і апрабіравана методыка правядзення лабараторных заняткаў па бібліяграфічнаму пошуку ў аўтаматызаваным рэжыме па інфармацыйных рэсурсах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (такім, як электронны каталог, паўнатэкставая база даных па заканадаўству). Плануецца правесці лабараторныя работы, прысвечаныя падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў у аўтаматызаваным рэжыме, каб студэнты на практыцы набылі навыкі ажыццяўлення тэхналагічных аперацый па генерацыі і папаўненню базы даных пэўнага зместу, засвоілі асноўныя этапы перадмашыннай апрацоўкі дакументаў, змястоўнай апрацоўкі масіву першасных дакументаў з выкарыстаннем асноўных лінгвістычных сродкаў, якія на сённяшні дзень выкарыстоўваюцца ў практыцы бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

У змястоўнай актуалізацыі курса, выкліканай праблемамі фарміравання бібліяграфічнай культуры студэнтаў ва ўмовах выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій, выдзяляюцца і тэмы, якія патрабуюць больш паглыбленага вывучэння. Сярод іх -- набыццё навыкаў работы з даведнікамі і каталогамі баз даных, з рэальна існуючымі базамі даных розных відаў — бібліяграфічнымі: фактаграфічнымі, паўнатэкставымі, гіпертэкставымі і інш.; больш глыбокая семантычная апрацоўка першасных дакументаў (рэфарміраванне дакументаў, прадстаўленне зместу дакументаў не толькі з дапамогай інфармацыйна-пошукавых моў класіфікацыйнага тыпу, але і дэскрыптарнага), апрацоўка розных тыпаў запытаў спажыўцоў для выкарыстання іх у аўтаматызаваным рэжыме; тэхналогія і методыка пошуку інфармацыі ў аддалёных базах даных; тэхналогіі CD-ROM і работа з імі ў бібліятэцы; падрыхтоўка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, адпавядаючых патрэбам новых груп спажыўцоў на інфармацыйным рынку, і г.д.

Для рэалізацыі такой змястоўнай перабудовы курса патрэбны адпаведныя ўмовы і вырашэнне рада арганізацыйных праблем.

Па-першае, ва універсітэце трэба сфарміраваць такое інфармацыйнае асяроддзе, якое б дазваляла і выкладчыкам, і студэнтам працаваць у новых інфармацыйных умовах: неабходна стварэнне сучаснай лабараторнай базы, абсталяванай не толькі камп'ютэрамі, але і маючай аплачаны доступ да аддаленых баз даных і да сусветных інфармацыйных сетак; камп'ютэрызацыя бібліятэкі, якая б дазваляла студэнтам адпрацоўваць уменні і навыкі работы ў жыцці карыстальнікаў інфармацыі; стварэнне лакальнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сеткі ва ўмовах універсітэта; набыццё генерыруемых рэспубліканскімі і замежнымі бібліятэкамі і інфармацыйнымі цэнтрамі баз даных розных відаў як вучэбных сродкаў і стварэнне іх фонду, даступнага для карыстання.

Па-другое, патрэбна павышэнне кваліфікацыі і адпаведная, больш грунтоўная, перападрыхтоўка выкладчыкаў спецыяльных бібліяграфічных дысцыплін, якую сёння проста немагчыма ажыццяўляць у традыцыйным даследчым накірунку. Увядзенне новых раздзелаў, тэм выклікала неабходнасць правядзення на факультэце круглага стала з мэтай абмеркавання міжпрадметных сувязей паміж чытаемымі курсамі. Актуальнай з'яўляецца і праблема канцэптуальнага падыходу да выкладання бібліяграфічных курсаў. Так, напрыклад, у разглядаемым курсе «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы» робяцца спробы навучыць студэнтаў выконваць бібліяграфічныя працэсы ў традыцыйным тэхналагічным рэжыме і ў аўтаматызаваным рэжыме, але ж гэта патрабуе павелічэння колькасці гадзін па курсу. У некаторых ВНУ культуры краін

СНД пайшлі па шляху выкладання самастойных курсаў (такіх, як «Камп'ютэрызацыя бібліяграфічных працэсаў», «Галіновыя ІПС»), якія выкладаюцца пасля дысцыплін, асвятляючых традыцыйную тэхналогію бібліяграфічнай работы. Але наўрад ці гэты шлях з'яўляецца аптымальным: на практыцы бібліятэкарам-бібліёграфам даводзіцца адначасова звяртацца і да традыцыйных, і да аўтаматызаваных крыніц пошуку; частка бібліяграфічных працэсаў не паддаецца аўтаматызацыі — і ў традыцыйным, і ў аўтаматызаваным рэжыме выконваецца чалавекам.

Фарміраванне бібліяграфічнай культуры будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў трэба разглядаць не толькі як неабходную ўмову якаснага ажыццяўлення бібліяграфічных працэсаў, звязаных з падрыхтоўкай і выкарыстаннем бібліяграфічнай інфармацыі, але і як умову ажыццяўлення педагагічнай, выхаваўчай дзейнасці, накіраванай на фарміраванне інфармацыйнай культуры грамадства, пэўных сацыяльна-дэмаграфічных груп, пэўных асоб.

Безумоўна, чым вышэй узровень уласнай бібліяграфічнай культуры спецыяліста, тым больш паспяхова ён падзеліцца сваімі ведамі з чытачамі. Але трэба звярнуць увагу на тое, што выхаванне спажыўца інфармацыі адбываецца не толькі ў ходзе спецыяльных мерапрыемстваў, запланаваных форм работы па фарміраванню бібліяграфічнай і інфармацыйнай культуры, але і ў ходзе штодзённых зносін з чытачом, выканання яго запытаў, выкарыстання чытачом падрыхтаванай бібліяграфічнай прадукцыі. Якасць паслуг і прадуктаў аказвае прамы і відавочны ўплыў на інфармацыйны патэнцыял спажыўцоў. Таму пры падрыхтоўцы студэнтаў вельмі важна, каб яны гэта ўсвядомілі і каб сярод іх не атрымалі распаўсюджанне такія стэрэатыпы прафесійнай свядомасці, якія прыводзяць да інфармацыйнай некампетэнтнасці, нізкага ўзроўню агульнай і прафесійнай культуры бібліятэкара-бібліёграфа.

На сённяшні дзень стаіць задача падрыхтоўкі спецыялістаў з новым тыпам мыслення — пераўтвараючым, адкрытым для



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новых ідэй, новых прыёмаў і метадаў работы, новых тэхналогій і інавацый, і ў гэтым напрамку на факультэце павінна весціся работа па стварэнню новых курсаў, змястоўнаму перагляду многіх тэм і раздзелаў традыцыйных курсаў.

**Аль Ахмад Нидал,** *аспирант*

## СИСТЕМА ПУБЛИЧНЫХ БИБЛИОТЕК В ИОРДАНИИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Иорданское Хашимитское Королевство — это одна из арабских стран, которая находится на Ближнем Востоке. До 1946 года Иордания являлась колонией Англии. Политика, управление общественным и экономическим сектором, а также образование до 1946 года находились в полной или частичной зависимости от английского капитала. После второй мировой войны все усилия прогрессивных сил страны были направлены на завоевание независимости.

Иордания, став самостоятельным государством, получила богатое многовековое наследие арабского народа, в том числе его язык, религию и историю.

В течение столетий иорданские библиотеки выполняли роль книгохранилищ, архивов и музеев. Они обслуживали лишь немногочисленную часть грамотного населения страны. Основной функцией библиотек было сохранение библиотечных богатств.

В Иордании, как и во многих других странах Ближнего Востока, первые библиотеки возникли при мечетях и религиозных школах, в них хранились богатые коллекции рукописей и книги по исламским дисциплинам.